2. Боровская О. Н. Белорусский вопрос на советско-польских мирных переговорах 1920–1921 гг. / О. Н. Боровская, В. Е. Снапковский, С. А. Третьяк // Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. В 2 кн. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2014. – Кн. 1. – С. 151–235.

3. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зб. дак. і мат.: У 4-х т. Т. 1. 1 жніўня 1914 – 18 сакавіка 1921 гг., ч. 2. 3 студзеня 1920 – 18 сакавіка 1921 гг. / уклад.: А. Ф Вялікі [і інш.]; рэдкал.: С. М. Мартынаў [і інш.]. – Мінск : Юніпак, 2008. – 393 с.

4. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1 : у 2 кн. / уклад. С. Шупа. – Вільня ; Нью-Ёрк; Менск ; Прага, 1998. – Кн. 2. – 790 с.

5. Боровская, О. Н. Советско-польские переговоры 1918–1921 гг. и их влияние на решение белорусского вопроса / О. Н. Боровская. – Минск : Белорусская наука, 2017. – 269 с.: ил.

## Венесуэльскі крызіс 2014 г. і пазіцыя Расіі

*Місюкевіч К. А., студ. II к. БДУ,*
*навук. кір. праф. Свілас С. Ф., д-р гіст. навук*

У постбіпалярную эпоху, з прыходам да ўлады Уга Чавеса (2002 г.), расійскія інтарэсы ў Венесуэле набылі геапалітычны характар. Прысутнасць Расіі ў рэгіёне, у першую чаргу, тлумачыцца стратэгічнай блізкасцю тэрыторыі дзяржавы да межаў яе галоўнага канкурэнта на сусветнай арэне – ЗША. Ідэалагічны фактар, які знаходзіў адлюстраванне ў рэзкай антыамерыканскай рыторыцы Чавеса і яго захапленні рэвалюцыйным мінулым Расіі, спрыяў усталяванню ўсё больш цеснага супрацоўніцтва [4]. Ва ўмовах аднаўлення канкурэнцыі паміж Расіяй і ЗША на пачатку XXI ст. Венесуэла апынулася адной з нешматлікіх краін, што цалкам падтрымалі знешнепалітычны курс Расіі: у 2008 г. яна прызнала незалежнасць Паўднёвай Асеціі і Абхазіі, а ў 2014 г. венесуэльскі ўрад на чале з новым прэзідэнтам Нікаласам Мадура прызнаў Крым расійскай тэрыторыяй [2].

Разам са стратэгічным фактарам варта адзначыць і расійскія эканамічныя інтарэсы. Вядома, што Венесуэла з'яўляецца не толькі лацінаамерыканскім, але і сусветным лідарам па запасах нафты, а Расія, адзін з сусветных лідараў па яе здабычы, зацікаўлена ва ўзяцці венесуэльскіх прыродных багаццяў пад свой кантроль. У 2014 г., калі на сусветным рынку назіралася масштабнае падзенне нафтавых коштаў, а ўнутры Венесуэлы толькі наспяваў палітычны крызіс, расійская нафтагазавая кампанія «Роснефть» пачала закупаць нафту ў венесуэльскай дзяржкарпарацыі PDVSA. Венесуэльская эканоміка, якая моцна залежыць ад экспарту нафты, знаходзілася ў катастрафічным стане.

Сітуацыя пагаршалася і праз санкцыі з боку ЗША, уведзеныя ў сувязі з прыходам да ўлады «чавіста» Мадура. У дадзеных умовах расійская карпарацыя перавяла PDVSA 6 млрд дол. за тры гады, што пацвярджае намеры Масквы аказваць падтрымку менавіта рэжыму Мадура, эканоміка якога церпіць ад амерыканскіх санкцый. Праз падтрымку рэжыму, адной з галоўных мэтаў якога з'яўляецца «супрацьстаянне гегемоніі ЗША», Расія ўласна развівае лінію антыамерыканізму ў сваёй знешняй палітыцы. Хаця пэўная эканамічная выгада для расійскай нафтагазавай сферы існуе: праблемы ў Венесуэле дазваляюць Расіі павышаць кошты на сваю нафту і пазбегнуць зніжэння ўзроўню здабычы [1].

Аднак у 2019 г. венесуэльскі крызіс перайшоў у больш вострую стадыю. Гэта было звязана са з'яўленнем на палітычнай арэне краіны Хуана Гуайда, які быў прызнаны прэзідэнтам ЗША Д. Трампам. Прыкладу амерыканскага лідара паследавалі еўрапейскія дэмакратыі: Германія, Іспанія, Вялікабрытанія, Францыя, Швецыя, Нідэрланды і іншыя. У той жа час шэраг краін прэзідэнцтва Гуайда не прызнаў, сярод іх былі КНР, Мексіка, Іран, Турцыя і, нарэшце, Расія, для якой прыход да ўлады праамерыканскіх палітычных сіл фактычна б азначаў страту свайго палітычнага ўплыву ў Венесуэле [3].

## Літаратура

1. Деготькова, И. Венесуэла предложила России свою нефть / И. Деготькова // Московский Комсомолец [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.mk.ru/economics/2019/03/01/venesuela-predlozhila-rossii-svoyu-neft.html. – Дата доступа: 22.02.2022.

2. Емельянов, А. И. Геополитические интересы в Латинской Америке / А. И. Емельянов // Центр стратегических оценок и прогнозов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://csef.ru/ru/politica-i-geopolitica/326/geopoliticheskie-interesy-rossii-v-latinskoj-amerike-4835. – Дата доступа: 22.02.2022.

3. Федотов, Д. С. Военно-политическое значение Венесуэлы для Российской стратегической перспективы / Д. С. Федотов // Cyberleninka [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/voenno-politicheskoe-znachenie-venesuely-dlya-rossiyskoy-strategicheskoy-perspektivy. – Дата доступа: 22.02.2022.

4. Фадеичев, Г. Е. Венесуэла как ключевой пункт влияния России в Латинской Америке: краткосрочные риски [Электронный ресурс] / Г. Е. Фадеичев // Евраз. союз ученых. – 2020. – № 2–5. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/venesuela-kak-klyuchevoy-punkt-vliyaniya-rossii-v-latinskoy-amerike-kratkosrochnye-riski/viewer. – Дата доступа: 22.02.2022.